# Свет першы і апошні

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

*Ян Чыквін*

# Свет першы і апошні

KAMUNIKAT.org

Беласток 1997

KAMUNIKAT.org

# Свяшчэнны дождж

Дажджу не хочацца шумна ісці,
Таму паціху тупоча, сівенькі.
Вясны панаднай гонкія касцы
Ваду, што скосяць, то збяруць ў сявенькі.

А ў маім доме гасне хатні агонь —
Ад розуму халоднага ці, можа, ад слязы?
Хоць ты падай, вясна свяшчэнная, мне сваю далонь
І таямніцу выяві жыцця — каб жыць.

Святлее дождж, какетліва ўглядаецца ў ваду,
Ў якой мігціць яго крыштальная прыгожасць,
І звонка харашынь сваю ён множыць,
Загледжана-заслуханы ў сімфонію сваю.

У гэтай музыцы, дакорнай і шчымлівай,
Ёсць цень адной заплаканай жанчыны.
Яна ка мне прыходзіць напамінам неспакойным,
Вяртаецца й бруіць, па той бок шыбінаў ваконных.

* * *

Тужу па зялёнавокай князёўне,
Як вернік тужыць па царкоўным звоне.

Іду на гасцінец, выглядаю, клічу,
А мая князёўна хваляю на Пцічы.

А мая князёўна у вятроў сястрыцай.
І вярбою ніцай богу ёй маліцца.

Ах, жыцця чужога ёй ўжо не пазбыцца!
А свайго не хопіць — каб жыццём нажыцца.

Тужу па зялёнавокай князёўне
Я клёнам адцвілым у пройме вячорнай.

# Жальба неадпаведнасці
(або скарга дрэва закаханага ўдзяўчыну)

Расту да цябе я
Зялёнымі ўсхліпамі,
Пошумам мысляў маіх.

Цягнусь наўздагон
Блакітнай гатычнасці дзён —
Не нашых... хоць бы на міг!

Маё раскрытае неба
Плыве над табой у нябыт
Набраклаю кнігай тугі.

Між намі завалы прастораў,
Між намі планідаў кругі
Звіваюць яснасць жыцця у сутонь,

Удымныя дрэваў ствалы,
Што вышэй ды вышэй
Імкнуцца ў нябесны агонь.

KAMUNIKAT.org

# Пацалунак

Як пляснуў тройчы пацалунак на пероне,
"Едзь абы-куды!" — прашамкаў з рэзігнацыяй
Мужык павешаны на слупе-клёне.
І, засмактаўшы мой даношаны касцюм і цела
Ў сваё дрыготкае, здранцвелае нутро,
Адзін цягнік, відаць, найгоршы, нетутэйшы,
Пацягнуў — рук разрываючы падковы —
Сваім імпэтам ў найчарнейшую дарогу,
Па якой асуджаных на несціханы перастук калёс
Вязуць-адвозяць-возяць у непамяць, ў сена-гора,
У іншы бок жыцця, дзе клеіцца і моршчыцца сутонне,
Дзе поранкаў спаволеных няма і радасці ад заходу нябёс,
А ёсць адна загубленая ў космасах прастора,
Нібы навечна куплены білет — той пацалунак на пероне.

KAMUNIKAT.org

# Кветка болю

... за кшталт тваіх далоняў,
   што атулялі мяне ў месцах найбольш збалелых,
за вызваленне мяне ад цяжару
   быць самым сабою і супраць сябе,
за лыжку ажыўляючай вады і
за саломіну, якую падала́, калі знясілены
   калодаю ляжаў, стары і недарэчны,
за музыку прытульную тваіх званкоў-грудзей,
   што павялі праз лабірынт асвежаных падумак цела,
за човен твой, а стырнікам якога ты мяне зрабіла,
   каб змог вярнуцца йшчэ ў жывых краіну,
за сон саснёны пра мяне, хоць без мяне, і
за мальбу тваю у прыцемках святыні,
   каб вывеў нас з даліны плачу,
за кветку, што ў табе ужо расце,
   пасеяная мною з болю кветка болю,
за кнігу адыходу і вяртання, што поначамі
   пішаш аба мне сабе, забыўшыся пра кон
   Александрыйскай бібліятэкі, і
за развітальнае тваё слаўцо, якое капнула ў разораную намі
   глебу суму-вечара слязінай абмірання або нараджэння —
   ахавальніца жыцця, я дзякую табе.

# Impromptu

Чый зманлівы там сеў вачэй
І чый сеў рук-махлівых крыл?

О, каб — немогучы — магла
Ты целам быць маіх касцей!

І каб была ў сабе маёй,
І — ад пачатку — нічыёй!

Каб кожны раз начэй імгла
Была табе і мне натоленаю
Жарсцяй мук...

Задумкай нейкі вобраз-мысль цячэ —
Нібыта хоча штось адкрыцца мне на міг
Далёкім бляскам-спевамі тваіх вачэй,
Жаночай музыкаю рук тваіх.

KAMUNIKAT.org

# Чараўніца

О, разумная галава,
Чараўніца зялёнага луга!
Твая зрудзелая трава
Пад маім буйнее плугам.

І вішні глядзяць на сад,
Дзе сцелецца вільгаць-раса.
Дзе шчодра-акруглыя сферы —
Свеціцца музыкай цела.

О, ўласніца ног, жывата,
Наезніца дзіўнай пагоні!
Чым болей корміш атавай,
Тым няўрымслівей коні!

# Жураўлі

Ляцяць жураўлі ў цёплыя краі
Праз Крым:
Крум-крам,
Крум-крым.
Праз Крым
Ключамі адлятаюць.

То ў Пакістан, то над Ніл
Праз Крым:
Крум-крам,
Ку-піл, ку-піл.
Клінам пралятаюць.

З Бацькаўшчыны ў Кувейт
Праз Крым:
Крум-крам,
Ку-піл...
І ўсё далей, усё слабей:
Ку-піл,
Крум-крам,
Ку-піл.

KAMUNIKAT.org

# Асіметрыя

*з ліста жанчыны*

Люблю я гэты свет,
Шкадую гэты свет,
Сумую па пяшчоце.

На тым сябе лаўлю —
Тваімі словамі малю,
З табой сама сабе адпавядаю.

Будзь ласкавы, мой свет,
Трымай мяне ў руках —
Я вельмі ад цябе залежу.

Ў табе ёсць, свеце, ўсё,
Каб я была шчаслівай,
Бо ты — мая сапраўднасць.

З табой адным хачу сустрэч —
Цвітуць ў чаканні кветкі пачуцця,
Я адчуваю пругкасць гэтага памкнення.

Замест хаваць ў грудзях адчай,
Пакінутасці боль, самоту —
Кахай мяне, кахай, кахай!

Сваім жыццём маё жыццё
Не адкладай на потым —
Пакуль ліпнёвы мёд у сотах.

Люблю я гэты свет,
Шкадую гэты свет,
Хачу тваіх пяшчотаў.

# У альбом

*на дзень нараджэння Г.*

Жыві, жыві, прыгожае тварэнне!
Шчаслівай будзь ад дотыкаў Жыцця.
Няхай жа збудуцца ўсе твае памкненні
І нашых дзён — хай доўжыцца працяг.

KAMUNIKAT.org

* * *

Свяна рассвятляе ноч.
Ноч паглынае свячу:
Клюе птах ружовы куст.

KAMUNIKAT.org

# Паэт і муза

Калі, забіты ў кут, ад года я усё пісаў адзін радок,
Летуценячы здабыць той лаўравы вянок,
Прыйшла кам не і села муза. Села пад іконай.
І глянуўшы, як у ваду, ў мае паперы,
Адкрыла вокны, адчыніла дзверы,
І прахаладзь хлынула вясновая,
І з яе спакойна-светлага аблічча
Капнула слязіна.

“Ці ўбачыць?.. Ці пакліча?..
Паблагаславіць мо мяне?.. Ці папракне?..
На вуха тайніцу шапне
Ці скрутак спісаных законаў
Абыякава уручыць мне?..”

Прамовіла:
“О, мілы Божа, як жа ты спанеў
І непрактычны стаў.
І хоць цяшы цябе, хоць рэж,
Нішто табе сям’я і дом, і мае раны...
Ты ў іншу, хлопча, закаханы
І ўжо не пазнаеш мяне.
Глядзіш — і не бачыш,
Што маеш і траціш.

А з замужняй, той мурзаю,
Ні дня не пражывеш.
І ночны час — не час без ласк
Жывой кабецiны...
Праўдзiвых муз цяпер нямаш
На нашым подлым свецeнi!"

KAMUNIKAT.org

* * *

Брат шапку скінуў —
і прыйшла вясна.
Ўзмахнуў рукой —
зазелянелі нівы.
Кашулю зняў —
і вырасла трава,
закаласіла жыта.
Запрог каня —
і жаць пайшлі
стальныя рукі,
вязаць і малаціць,
капаць і звозіць.
Ячмень, пшаніцу і авёс
сталёвы конь прывёз —
што ў свіраны, што ў клуні,
дзе да кружэння галавы
гара стаяла сушанай травы.

А каб прыйшла зіма,
шапку брат надзеў, аднак.

# З даўняй кнігі

Дзе неба сыпле сіні дождж надзей,
за горадам аддаленым кнігу я раскрыў:
чытаю лес, чытаю трапятанне крыл,
старонку поля сыпкага —
стары запылены раздзел
фаліянта даўняга з малюнкамі астылага цяпла,
з гравюрай радасці мінулай-цьмянага былля.
Чытаю сцежак кволенька пазначаны сюжэт,
дзе паабапал сум пасеяны і мітусня
і дзе, рассеўшыся, сядзяць усе відовішчы жыцця
і, што было раней не помнячы, тахтоляць свет.

Мяне не цешыць гэткая бяздушная радня.
Мне — каб паспець натрапіць на адно імя
запісанае мне у гэтай кнізе Вышняй воляй.
І, з кнігі вырваўшы, увесці ў свет людзей,
дзе неба нам дазволіць полымем маім
яе агонь абняць...

# Сучасная Ніке

Меднавалосая Ніке ішла прада мной.
Яе шавялюрадымілася пахам маёйдаўняй спадзевы,
Што ёсць іншы свет, недзе там, за сёмай ракой:
Рухліва-прынадныі першаісна-боска-напеўны,
Дзе ў жывых кругах нагрэтага святла
Расхінутыя свету па-дзіцячыд ушы;

Куды, аднак, ніколі не ступіць мне, нават ў снах.

Ішла, крылатая. Мой цень — за ёй, меднавалосай,
Той, што адтуль з'явілася, мабыць, наміг,
Каб абцякальнымі абрысамі акругласцей сваіх,
Перамагаючы, тутэйшае жыццё наўкольнае абагавіць.

* * *

Рыжы, пахучы мёдам гародчык,
Геаметрычны спакой, летні одум.

Але пыл смутку, трывожна-пякучы,
За сэрца сціскае
Зялёным вянком прахалоды:
Мая хата з дажджу,
Мая хата стаіць пакрыёму.

Увайдзі, маё сонейка, ўдом,
Сонцанятам будзь ў маім доме!

* * *

О, як гады празрыстыя ляцяць,
Калі, у позні час жыцця,
Любоў шалёная прыходзіць.

Як ранняй слодычы вяртаецца ажур,
Як маладосць варушыцца на сподзе!

Як хочацца душэўнага цяпла
І шчасце шчасцем затрымаць!

Але няма спагады у прыродзе.
На свеце радасці няма.
Ёсць толькі полымя адно, гарачае,
Якім гарыць і неба, і зямля.

# Выпрабаванне спакусай

Самота стукае ў дзверы, самота
ўваходзіць у дом і ў маю чашу жыцця,
налітую спаўна, кладзе жывы пялёстак ружы
колеру вуснаў жанчыны распуснай.

А мне мілейшае маўчанне палыну,
мне слодычу — ажухлая цыкута.

KAMUNIKAT.org

* * *

Жанчына,
што нечакана выйшла
з рамы вечнасці ў мой злічальны час,
была
Дзевятай сімфоніяй Бетховена
ін мінор.

У голасе яе
гучаў далёкіх продкаў хор.
І ў гэтым хоры,
вельмі паволі і пявуча,
яна ка мне плыла па моры
усёй постаццю дзявочай.

# Чалавек дажджу

Дождж ідзе на маю галаву пахмурна-навесны,
Дождж-напамін пра хуткаплыннасць светлаблакітнай песні.

Дождж ідзе. На маю галаву. Дождж серабрыставаласы.
І сплывае як ласка і глыбейшы ясэнсы маўклівых нябёсаў.

Дождж ідзе і хвалюецца сам і мяне ён хвалюе да плачу,
Шапаціць надмаёй галавой як дакормілагучны маці.

Ідзе дождж як не дождж — на маю галаву сыплецца шклі ва
Нараканняў далёкіх і блізкіх людзей і праклён іх шчаслівы.

На маю галаву дождж ідзе. Дзень у дзень, дзе ні дзенься,
І плёхае следам па мокрых слізгах майго неадбежнага ценю.

Дождж празрыстаю песняй з вільготных аблокаў ідзе...
І я, родным ахутан макроццем, іду па плыткай, звонкай вадзе.

KAMUNIKAT.org

# Паводле Іова

Летась добра было. Сонца папераменна
стварала дзень і ноч. Нумараваныя дні
праміналі нябачна, няўхільна
і без майго намагання.
І ночы штоночы жыццё вышывалі
жывою мярэжкай — без майго намагання.
І без высілку майго дождж ішоў
і пясок асыпаўся з магіл,
і ткаўся лугамі з гаючых траў кілім.
І рыба жыла, без мяне, у вадзе,
і птушкі будавалі гнёзды.
Наўздзіў наўкол сады цвілі
і па далінах коней табуны
ганяліся за табунамі жарабіц.

Я непатрэбны быў, здавалася, нідзе
нікому ў гэтым свеце, першым і апошнім.

Але нечакана ў шыбіну акна
раз і другі з налёту стукнуў верабей,
і з хвойніка пажар прыйшоў пад хату,
і вецер адчыніў вароты мору.
І Бог, сам Бог тут затрымаўся надаўжэй
дзеля праверкі чалавека у яго парогах.

Дзе стол яды быў поўны і пітва —
стаяла з дошак негаблёваных труна.

# Нейк сталася

Нейк сталася, што я паіў каня.
Ажурнай цеплынёй ляжала сонейка на грыве.
Ціш стрыглі вушы палахліва,
Хоць яблыкі вачэй былі ў агнях.

Мы з ім жылі не як браты,
Таму, пакуль я даставаў вады
І наліваў з чарпальнай кадзі
Ў ягонае напойнае вядро,

Атласам губ мяне ён гладзіў
І яблыкаў сваіх наводзіў мікраскоп
На кучму валасоў і на загар плячэй
Ды асабліва ў гузікі маіх вачэй.

Праз іх, відаць, там бліскалі й яму агні —
І жорны мозгу разлічалі свята й будні,
Што я налью яму вады з ягонай студні
Ў ягоную пасудзіну, ў ягонай цішыні...

Як на вадзе мінае ўсё, як на агнях!
Няма даўно высокай постаці каня,
Той студні ўжо даўно няма
Ні сонейка таго. Вядома — і мяне няма.

kamunikat.org

# Тапелец

Лета ўсамоце. Лета ў жалобнай цішы.
Адзін-аднюткі. Тулю да сэрца твой малы партрэцік.
Туга па страчаным мяне сабой калыша.
О, мае хмары атлантычныя і філіпінскі вецер!

О, філіпінскі вецер мой і атлантычнае пахмар'е,
Тугі па страчаным вы неразборлівыя дзеці!
Глушу свой боль балючымі музычнымі пажарамі,
Ў пажарах гэтых мілая каханым целам свеціць.

Плыву праз ночы ноч, асляплены самотай лета,
На ўзвейных крылах філіпінскіх ветраў.
Туга па страчаным расце ўва мне балючай цішай
І, як тапельца ў цінах, мроямі музычнымі калыша.

KAMUNIKAT.org

# Восень

Саспелі нічыйныя грушы і слівы
Ды падаюць ў жухла-старую травіцу.
І дзэнькае сонцава струнка шчымліва.

Птушыныя душы пяюць над крыніцай
Кантаты расстання й вяртання канцоны —
Глыткоў пяць паветра, глыточак вадзіцы.

Макрынкі вісяць у завойцы лісцёўнай.
Дзе шчэплены шчэпкі змуршэлых галін,
Свеціцца многа чароўных свяцёлак.

Бязмэтна прасторай шасціць парыжэлы прамень.
Патайна знікаюць будоўлі рахманых раслін,
І кожная ноч рассцілае на дзень
Свой усё новы дыван-габелен.

І зноў жа паўторыцца ў садзе
І паданне груш, і паданне сліў!
Толькі мне ўжо не бачыць вясны салаўіна-шчаслівай.
Дык на што ў белым свеце ты, восень, дагнала мяне?

# Як калісь

Неверагодна. Чорная музыка ўладарыць Варшавай,
Усе вуліцы робіць непраезнымі аднолькава.
Хто б ні з’явіўся — ідзе крокам Раскольнікава,
Усе жанчыны — найпрыгажэйшымі вабнымі полькамі.

Блізкае ад мяне адплывае і стаецца неймаверна далёкім.
Хоць вечар неонамі пісьмаў к сабе прыйсці запрашае,
На скрыжаванні стаю, як калісь, і адчайна цалую твой локан
І бачу зноў тое, як размінаюцца нашых двух жыццяў аблокі.

Як і тады, пра сябе я й цяпер ведаць нічога не ведаю,
Чую адно, што нельга чагосьці ўсё мне. І гэтае нельга ўсё бліжай —
Як нельга пайсці адначасна ў шчаснасць Новага свету,
Калі ўжо пад чорную музыку йдзеш вуліцай Святога крыжа.

KAMUNIKAT.org

# Вяселле

Нейкае свята было. Убудзёны дзень
насупраць вады гарэла шчаслівая хата —
моладзь гуляла ў жыццё і агонь падкладала.

З нічога ўспыхнуў пажар. Мілосным жарам
вусны ўспалалі і ад крыві запалыхала ўсё цела.

Полымем яркім шугалі белі кашуль,
ногі прынадна свяцілі ў гарачых спадніцах.
Неба мала было для жывога агню
і званоў было мала на гулкай званіцы.

Ластаўчын лёт, зігзагам, між надваконнем і хмарай
голкай у сэрца кальнуў — невядома з чаго і адкуль:
гэтак жа зноў няма ў гняздзе птушанятак.

Ціхай манашкаю крэсліць пустую прастору
пташка старая
.

KAMUNIKAT.org

# Дзеці Чарнобыля

Дзеці спяць на падлозе,
Як авечачкі, збіўшыся ў кучу.
І зноў адно з іх не можа
Упасці ў сонныя травы,
У матчыных рук калыханне —
Вочкі трэ ўласнаруччу.

Як цвет яблыні танклявай,
Душа дзіцяці светлай плямай
Спаўзла са столі і па сценах
Паволі йшла дрыжачым бляскам
Да сонца звабленага шклянкай,
Туды, дзе жыў срабрысты ляскат.

Дайшла — і ўзіхотныя промні апала...
І трэск па шкле зышоў авалам.

KAMUNIKAT.org

# Шпіталь

Зверху востра сляпіла святло.
Прыціснуты к цвёрдай паверхні,
Я пусткай валодаў сваёй,
Крыкам я быў, і крык быў тлом.
У балесна-імглістай лагодзе,
Вільготнай гаранцы сноў
Мне рукі забралі абедзьве, найменей,
І вярбе аддалі за акном.
Галяк, што ірве апендыцыт,
Бы шылам — пальцамі: цыт і цыт!
А прага размовы ў прыродзе —
Як жэрдкі і белага пеўня
Ці выбітай шыбіны з клёнам.
Там у там на голлі зялёнай слівы
Вешаўся нехта вельмі шчаслівы,
А побач кнігу пісаў шалёны.

І такая там ціш ад хімічана,
Што ў тэрмометрах топіцца ртуць
І чутно — з начнікамі начніцы
Усё сарочкі вар'ятам ткуць.

KAMUNIKAT.org

* * *

Матэрыя —
прадметы, рэчы
вельмі любяць,
калі іх кранаюць,
гладзяць, выкарыстоўваюць,
перастаўляюць, папіхаюць,
таўкуць, націскаюць,
круцяць да сёмых патоў
і разаграваюць да белай гарачкі.

Прадметны свет
штодня, кругласутанна
дамагаецца чалавечай рукі,
цеплыні ягонай душы.
Чапляецца чалавека,
не адпускае ад сябе,
засмоктвае, хоча —
у рэшце рэшт —
прыпадобніць да рэчаў у сябе.

Браты мае і сёстры.

KAMUNIKAT.org

# Канец эпохі

Навокал чужыя вочы
і слоў калючых калоссе.
І сутунак — ні блакітнага неба,
ні светлых даляў.
Жоўты жах развесіў
на грудзях свае медалі
і здзірае з галавы
апошняе валоссе.

Як скінуты нагою
ў рэчку камень —
зляцелі ідалы
з высокіх
пастаментаў.

Цемра свой сум адкусіла
з хрумстам —
і ноч выварочваецца
з чорнага глупства.

KAMUNIKAT.org

# Лясное возера

Чаму ў жвіроўні вечнасці
Затрымаліся часу стрэлкі
Перад зенітам поўдня —
Нібыта боязна чакаючы кагось,
Хто меў з'явіцца вось,
Ды не з'яўляецца ў тым чалавечым пекле.

Па той бок, там, калосяцца жыта
І воды з мёртвых лечаць,
І галавастых шчасця сысуноў
Штодня выводзяць прамяністыя кабеты.
А тут — перамяшчэнне душ адно
Ў цырульна-сцішаным паветры.
Шкілеты іх на могільніках гаманяць,
Апраткі чорным болем свецяць.

Як возера лясное, над якім
Вісіць бяссмертнікам Кашчэй,
Не мрэ і не жыве зачараваны край
Аблакітненых вачэй —
Ні хваль на ім пераствaральных,
Ні ў тонях вадакрутаў хоць бы паўжывых...

Рукой дрыжачай я кладу, Айчына,
На твар твой свята-светлыя крыжы.

* * *

*ля помніка Пілсудскаму*
*у Беластоку*

Пілсудскі-дзед глядзіць на ўсход.
З намі ён быў ці толькі марыў
Польшчу пабольшыць на тлусты кусок,
А калі не — множыць смерць і пажары?!

Гарыць усход у бронзавых вачах,
Але жалезнаю нагой не ступіць кроку.
І будзе так стаяць — з галубамі на плячах,
Скамянелым гістарычным вадасцёкам.

І вечна будзе бачыць, як з турэмнай брамы
З песняй "Мы выйдзем шчыльнымі радамі"
Паэта цень выходзіць ўбел-чырвона-белае убраны...

* * *

Покуль у невады вечныя дзённае сонца
Не злоўлена сонцам счарнелым,
З свету зыходзячы я астаўлю красу найпрыгожую —
Бляск жыватворнага Немага.

Цела з праменняў ягоных было далікатным
І гнуткім, як чыстага золата пробы.
Рукі былі, каб лавілі гасцей наймілейшых —
Ганцоў светланосных — паўсюды, заўсёды.

Ах, вылятаюць з мяне, бы з гнязда, пакрыёму
Апошнія спелыя, цёплыя промні.
І нічагуткі я хутка, як дрэва-не-дрэва,
Не буду, не буду ні бачыць, ні помніць.

Смерць непазбежная будзе калісьці пазбежнай,
Калі хто не схоча яе прыпадобы.
Нам яшчэ суджана з белаю дамай ісці ды ісці
Пад чарнотаю сонца па мёртвых гарадах.

KAMUNIKAT.org

* * *

Самакрыльна руха ўся ў паветры
Вогненна-празрысты напіс
ХОПІЦЬ СМЕРЦІ УСІМ —
загадкавы і страшны.

# Tessera hospitalis

*Ніне Мацяш*

Чым я магу дапамагчы табе, мой дружа,
У хвіліне той, якую адчуваеш,
Што прыйшла і што апошняй…
І нямаш ніякага ні кола, ні саломіны ад блізкіх,
Ні ад чужых — ста лекараў, філосафаў і багасловаў,
Ні ад іншага чаго жывога,
Ні прадметаў, што слухмяна зыркаюць у тую
Страшную шчыліну быту, у якую
Загадаў першым глядзець,
Сам будучы ячшэ няпэўным парасткам жыцця
квітнелага,
І з палачкай зялёнай у руцэ
Усё бег далінай марафонскай без затрымкі
Так безразважна! — І сёння ты, яшчэ радасцяю
Пераможцы акрылены, не бачыш,
Яшчэ не разумееш як бы, што вось прыбег…

Малодшы духам, я перадам таму,
Хто следам і за мною
Таксама без агляд кі бегчы будзе,
Зноў малодшаму, за нас абодвух,
Жарынку памяці — не болей, аб тваёй прысутнасці
Пад сонцам ў свеце чалавечым —
Добрым, сонечным заўжды
І бескарысным маладым мужчыне.

Так буду паўтараць, бо ты і быў такім,
Спагадліва-разумным у сваіх мыслях пра сябе —
Хоць у паводзінах з людзьмі і рэзкі быў,
Злапамятны і крыўдзіў шмат каго,
Слабейшы хад сябе найперш,
Сабе прыпісваючы ўзлосці слабасць.

Ды Бог табе суддзя — і мне!
Такое нашае быццё!
Яно нас ловіць ў сець сваіх нікчэмных рэчаў
І, як рыбіну папаласкаўшы хвілю
У жывой вадзе-жывіцы, без злосці выкідае
З утульнай тоні на сухі, зрудзелы бераг.

Прабач... У параўнанні гэтакім
Спадручна-нескладаным
Шукаю нейкай дапамогі я
Свайму нялётнаму ўяўленню...
Перад абліччам вечарэючым тваім,
Перад маўклівым звонам вечнаты,
Перад тым болем, што баліць усё прасцей,
Я дзякую, што — як табою я — быў мною ты.

# Два лісты

*памяці Уладзіміра Калесніка*

Я ўвайшоў,
каб спытаць пра сваё лісце
        у індыйскіх мудрацоў.

На старатамільскай мове
мінулае і прышласць прышэльца вырыты
дробненькімі значкамі,
для маласпрактыкаванага вока амаль
                                        нераспазнавальнымі.

Для кожнага маюцца два лісты —
у 3665 тамах на 365 лісцяў у кожным.

На адным — аб перажытых ужо жыццях шматразова,
на другім — што ніхто не памірае назаўсёды
                і аб наступных увасабленнях

на планеце Зямля,
паложанай на малазначным краі Млечнай дарогі,
аддаленай ад яе цэнтра на нейкіх 30 тысяч
                                        светлавых гадоў.

Уладары часу,
прыбыўшы з вельмі далёка
на тахіёнавых машынах,
перададуць нам аб’ектыўны вобраз
                                        нашай рэчаіснасці —

І не паверым.

KAMUNIKAT.org

# Страла немінучасці

I

Мама, мама,
які нешчаслівы
ваш сын!

Калі вы
мяне нарадзілі,
вам гаварылі:
на што вы яго
на свет прывялі!

... на што тады
салаўямі сады
былі абсыпаны?

... на што тады бэз
ліловым ветрам лез
у калыску сына?

... і жанчыны з нашай студні
вядзерцам, як асіліць,
нядзелю ў свае будні
насілі і насілі?

KAMUNIKAT.org

І вяз і бярозы
так грацыёзна
на што тады
хадзілі ля вокан?!

II

А ты жыла! З якою мукай,
з якой надзеяй з дня ў дзень
Сябе ты ўсю пералівала ўнукам!
Як пелікан
сваёй крывёй
карміла ты дзяцей!

III

Цяпер стаю, як крыж пахілы,
над затравелаю яе магілай.

О, каб ва ўдзячнасці маёй я мог
яе дзяўчынаю падняць адтуль жывой!

Бо шчасце быць на свеце нешчаслівым!

KAMUNIKAT.org

* * *

Спыніліся дрэвы над рэчкай у лесе,
Спыніліся дрэвы над рэчкай у полі.
На дрэвах у лесе агонь хтось павесіў,
А дрэвам у полі абрэзалі голле.

Высахла рэчка пад дрэвамі ў лесе,
Высахла рэчка у полі пад дрэвам.
У гэну пустыню ізноў з паднябесся
Змей не ізыдзе спакусай да Евы.

KAMUNIKAT.org

* * *

І я калісьці быў
супольнікам сям'і буйна-зялёнай
бярозы і вяза, рабіны і клёна.
Яны гадавалі мяне, сваім ценем
адхілялі шкоднае праменне.
Кармілі, лячылі, вучылі
кронаў зменлівай красою,
змеепаўзучаю карою
і мацатой карэнняў.

"Вякуй сярод прасторы нашай
і сокі пі найпоўнай чашай!
Вяртлявы ты, нат копамі ідзеш па сцежцы,
а мы шумім на месцы;
ды разам мы —
сонца прабоскага адзіны подых!
І, сонцападобныя, усё жыццё брыдзем
па водах".

# За тым мурам

Ведаю, ведаю — свет быў перада мною!
Але й ведаю, што ён існуе са мною, ува мне і праз мяне
ды будзе — калі мяне не стане.
І ведаю — верай — што раней не было мяне такога,
што Жыццём к жыццю пакліканы, пэўна, цалкам выпадкова
з ланцуга арганікі, невядома як доўгага.
І хтосьці даў мне разуменне сябе і свету,
і патрэбу будавання сэнсу для *вялогаі малікага*,
і каб ведаў, што Жыццё — хоць вечнае — для мяне
не вечнае. Я но сталася тут, на гэтай планеце, знічам
у парыве таемным чагосьці да нечага таямнічага
і, споўніўшы сваё прызначэнне, жыццяў не пытаючы,
перацячэ праз усё вядом ажывое і род чалавечы
і станецца формай, відавочна, яшчэ больш дзівосна-магічнай —
Але ўжо там, за тым мурам, адкуль ні Слова, ні Рух
нас не паклічуць!

KAMUNIKAT.org

* * *

Не камень я, не векавечны —
Таму згартаю святло да святла,
Таму збіраю цяпло да цяпла.

І свет трымаю ў абдымку хлапечым.
Насустрач людзям душа ўсё імкне —
І, можа, гэта і ёсць жыццятворнасць ва мне?

Маўклівы сэрца чаўнок — ён трапеча
І тчэ кілім з невагомага жалю
З выяваю болю на дрогкіх скрыжалях.

Калісьці песня й для сэрца была агнеча
Цвітучай любасці ўсадзе пануццяў —
Цяпер адно сны тускноты мярэжкаю ткуцца.

Наводдаль спеўна змяркаецца вечнасць.
А я — аскепкі цяпла да цяпла,
А я — агніцы святла да святла.

* * *

Кнігі старых паэтаў
чытаю з канца:
густы мёд іх мудрасці
там наліты ў соты
і там — не мускулісты
торс, граніт
ці залаты пясок,
але ўсё той
дэдалаў лабірынт
і тайніцы пячаць.

KAMUNIKAT.org

# Змест

Свяшчэнны дождж ........................................ 5
"Тужу па зялёнавокай князёўне" ........................ 6
Жальба неадпаведнасці ................................. 7
Пацалунак ............................................. 8
Кветка болю ........................................... 9
Impromptu ............................................. 10
Чараўніца ............................................. 11
Жураўлі ............................................... 12
Асіметрыя ............................................. 13
У альбом .............................................. 15
"Свяча рассвятляе ноч" ................................ 16
Паэт і муза ........................................... 17
"Брат шапку скінуў" ................................... 19
З даўняй кнігі ........................................ 20
Сучасная Ніке ......................................... 21
"Рыжы, пахучы мёдам гародчык" ......................... 22
"О, як гады празрыстыя ляцяць" ........................ 23
Выпрабаванне спакусай ................................. 24
"Жанчына" ............................................. 25
Чалавек дажджу ........................................ 26
Паводле Іова .......................................... 27
Нейк сталася .......................................... 28
Тапелец ............................................... 29
Восень ................................................ 30
Як калісь ............................................. 31

Вясельле ........................................................ 32
Дзеці Чарнобыля ........................................................ 33
Шпіталь ........................................................ 34
“Матэрыя” ........................................................ 35
Канец эпохі ........................................................ 36
Лясное возера ........................................................ 37
“Пілсудскі-дзед глядзіць на ўсход” ........................................................ 38
“Покуль у невады вечныя дзённае сонца” ........................................................ 39
“Самакрыльна рухаўся ў паветры” ........................................................ 40
Tessera hospitalis ........................................................ 41
Два лісты ........................................................ 43
Страла немінучасці ........................................................ 45
“Спыніліся дрэвы над рэчкай у лесе” ........................................................ 47
“І я калісьці быў” ........................................................ 48
За тым мурам ........................................................ 49
“Не камень я, не векавечны” ........................................................ 50
“Кнігі старых паэтаў” ........................................................ 51

KAMUNIKAT.org

Бібліятэчка
Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа"
Серыя заснавана ў 1990

Кніга дваццатая

Тэхнічны рэдактар Аляксандр Максімюк
Праект вокладкі Уладыслаў Петрук
Copyright © 1997 by Jan Czykwin

ISBN 83-85918-12-4

Publikacja sponsorowana
przez Ministerstwo Kultury i Sztuki

---

Druk "Offset-Print", ul. Broniewskiego 14, Białystok